# ВОД З Ы Ў

на аўтарэферат дысертацыі **Буйко Ц.С.**
"Этымалагічныя гнёзды дэндралагічнай лексікі ў беларускай і польскай мовах на агульнаславянскім фоне: параўнальна-гістарычны аспект"
на саісканне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук
(па спецыяльнасцях 10.02.01 – беларуская мова, 10.02.03 – славянскія мовы)

Дысертацыя Буйко Цімура Сяргеевіча прысвечана вырашэнню адной з актуальных задач айчыннай мовазнаўчай навукі, а менавіта вывучэнню беларускага лексічнага складу (дэндралагічнай лексікі) у кантэксце індаеўрапейскіх моў.

Ва ўзбагачэнні слоўнікавага саставу мовы беларускай народнасці важную ролю мелі і маюць даследаванні цэласных пластоў старажытнай беларускай лексікі з улікам усіх магчымых словаўтваральных сувязей у агульнаславянскім рэчышчы.

У рабоце ўпершыню ў беларускім мовазнаўстве ў навуковы зварот уведзены новыя праславянскія, беларускія і польскія рэканструяваныя лексемы. Удумлівы аналіз фактычнага матэрыялу, навуковае асэнсаванне фарміравання славянскай дэндранаменклатуры дазволілі Ц.С. Буйко высветліць дэрывацыйныя сувязі, а таксама страчаныя генетычныя суадносіны паміж роднаснымі лексічнымі адзінкамі ў межах этымалагічных гнёздаў дэндралагічнай лексікі.

Навуковая навізна заключаецца ў тым, што ў дысертацыі даследаваны этымалагічныя гнёзды дэндралагічнай лексікі беларускай і польскай моў на агульнаславянскім фоне ў лінгвістычным і пазалінгвістычным аспектах; сфарміраваны найбольш поўны лексічны корпус этымалагічных гнёздаў дэндралагічнай лексікі, агульны для беларускай і польскай моў.

Важнымі для айчыннага мовазнаўства з'яўляюцца створаныя аўтарам дысертацыі дадаткі этымалагічных гнёздаў дэндралагічнай лексікі.

Не выклікае пярэчанняў выснова, што прыналежнасць дэндронімаў да праіндаеўрапейскай, балтаславянскай ці праславянскай лексічнай спадчыны карэлюе з аб'ёмам этымалагічных гнёздаў, вытворных ад гэтых дэндронімаў.

Матэрыялы дысертацыйнага даследавання з'яўляюцца перспектыўнымі для распрацоўкі тэарэтычных і метадалагічных пытанняў параўнальна-гістарычнага мовазнаўства, этымалогіі, этналінгвістыкі, лексікалогіі і лексікаграфіі; пры складанні этымалагічных слоўнікаў і даведнікаў; пры падрыхтоўцы спецыялістаў-філолагаў і стварэнні для іх падручнікаў, дапаможнікаў па этымалогіі, славянскім і індаеўрапейскім мовазнаўстве.

Дысертацыя Буйко Ц.С. прайшла належную апрабацыю, пра што сведчыць удзел у шматлікіх канферэнцыях, а таксама змест 13 публікацый.

Праца ўяўляе сабой самастойнае навуковае даследаванне, мэта і задачы якога поўнасцю раскрыты.

Лічу, што Буйко Ц.С. за даследаванне “Этымалагічныя гнёзды дэндралагічнай лексікі ў беларускай і польскай мовах на агульнаславянскім фоне: параўнальна-гістарычны аспект” заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасцях 10.02.01 – беларуская мова, 10.02.03 – славянскія мовы.

Водзыў разгледжаны і зацверджаны на пасяджэнні кафедры беларускай філалогіі УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна» 26.12.2023 г., пратакол № 6.

Рэцэнзент –
дацэнт, кандыдат філалагічных навук,
дацэнт кафедры беларускай
філалогіі УА «Брэсцкі дзяржаўны
ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна» Л.В. Леванцэвіч

Загадчык кафедры беларускай
філалогіі Н.Р. Якубук

Установа адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна»
АДДЗЕЛ КАДРАЎ

Подпіс Леванцэвіч Л.В. Якубук Н.Р. засведчваю
Нач. АК БрДУ
27.12.2023 г.